ВЫСТАВА Ў ГОНАР ВАЕННЫХ МЕДЫКАЎ У БРЭСЦЕ 3

ПЛАНЫ НОВАГА ДЫРЫЖОРА ВЯЛІКАГА ТЭАТРА 6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

15 ЧЭРВЕНЯ 2024 г. СУБОТА

№ 116 (30250)

ЗВЯЗДА

«ПРАБЛЕМЫ, ЯКІЯ ЎЗНІКАЮЦЬ, ТРЭБА ВЫРАШАЦЬ КОМПЛЕКСНА І ПАСЛЯДОЎНА»

Акцэнты нарады Прэзідэнта з кіраўніцтвам Саўміна

Фота БелТА

Важныя і прынцыповыя пытанні, якія патрабуюць неадкладнага вырашэння, разгледзелі на нарадзе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з кіраўніцтвам Савета Міністраў. Склад удзельнікаў досыць шырокі, былі запрошаны таксама губернатары, прадстаўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта і дзяржаўных органаў.

КАРУПЦЫЯ — ГЭТА РЖА НЕ ТОЛЬКІ ЭКАНОМІКІ

Пачалі з «балючых пытанняў», як заўважыў Аляксандр Лукашэнка, для размінкі, каб разумелі, з чаго пачынаецца рабочы дзень Прэзідэнта. «Сумна, але факт, калісьці я папярэджваў усіх, і за гэтым сталом прысутнічаюць людзі, якія не адзін раз чулі ад мяне выраз: «лепей бедным на свабодзе, чым багатым у турме». Шырока разышлася гэтая фраза ў нашым грамадстве, сярод народа. І як вы разумееце, я недарма гэта кажу. І я вельмі не хацеў бы, каб мяне чарговы раз папракалі і напаміналі, што перад нейкім электаральным цыклам ці падчас яго я саджуся на антыкарупцыйнага каня. Але разумныя журналісты даўно заўважылі, што Лукашэнка даўно, ужо гадоў 30 на ім сядзіць», — сказаў Прэзідэнт. Ён нагадаў, што першую ў гісторыі нашай краіны антыкарупцыйную камісію ўзначальваў «той самы Лукашэнка».

«Я не забыў, адкуль я прыйшоў. Я бачыў усю гэту несправядлівасць і так далей і да таго падобнае. Карупцыя — гэта ржа нашай эканомікі, якая наносіць найжорсткі ўрон нашай дзяржаве не толькі ў эканамічным плане, але і ў палітычным», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Прэзідэнт растлумачыў, што нездарма ўзняў гэтую тэму ў прысутнасці кіраўніцтва ўрада, якое, па яго словах, часта паўтарае, «што мы дзесьці кагосьці перацяснулі».

Кіраўнік дзяржавы агучыў некалькі прыкладаў карупцыйных праяў сярод высокаспастаўленых асоб, аб чым амаль кожны дзень дакладваюць праваахоўныя органы. Следчым камітэтам Рэспублікі Беларусь у адносінах да першага намесніка начальніка Беларускай чыгункі Пятра Дулуба ўзбуджана крымінальная справа. У тайніках кватэры і ў загарадным доме фігуранта канфіскаваны грашовыя сродкі на больш як 3 мільёны 200 тысяч долараў. «Чыгунка, першы намеснік — што я магу думаць пра кіраўніцтва чыгункі», — заўважыў Прэзідэнт.

У той час, калі кіраўніцтва чыгункі «назапашвала» такія грошы, урад прасіў Прэзідэнта забрасць у Баранавіцкага аддзялення чыгункі калгас «Свіцязь», бо ў чыгункі не было грошай на яго ўтрыманне. «Тры мільёны, калі б ён, гэты першы намеснік, у калгас уклаў, там бы не было праблем», — абурыўся Прэзідэнт. Ён нагадаў сваё патрабаванне — дапамагаць сельскай гаспадарцы, замацоўваць калгасы за прадпрыемствамі, каб яны ўкладваліся і людзі туды ехалі працаваць. «Яны бедныя, у іх грошай няма. А чаму крадуць?» — іранічна заўважыў Прэзідэнт.

СТАР. 2

ТУТ НЯМА ВЫПАДКОВЫХ ЛЮДЗЕЙ

Работнікам аховы здароўя

Дарагія сябры!

Віншую вас з Днём медыцынскіх работнікаў.

У гэтай сферы няма выпадковых людзей, і кожны стаіць на варце забеспячэння нацыянальнай бяспекі.

Вы даяце ўпэўненасць у заўтрашнім дні мільёнам беларусаў, дапамагаючы з'яўляцца на свет малым, прыходзячы на працоўнае месца з пачуццём абсалютнай гатоўнасці годна адказаць на любы прафесійны выклік, чым заслугоўваеце павагу і ўдзячнасць пацыентаў, якія атрымалі кваліфікаваную дапамогу.

Толькі па-сапраўднаму самаадданыя людзі, адкрытыя для новых ведаў і дасягненняў навукі, могуць вылечваць, прымаць дакладныя і своечасовыя рашэнні для захавання бясцэннага жыцця чалавека.

У гэты святочны дзень жадаю ўсім, хто ўзяў на сябе адказнасць за здароўе людзей, міру, дабра і дабрабыту.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Намеснік галоўнага ўрача па хірургічнай дапамозе 10-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска хірург вышэйшай катэгорыі Ларыса ТАРАСІК у прафесіі больш чым 35 гадоў. Мы заспелі яе на выхадзе з аперацыйнай — стомленую, але ў добрым настроі: шматгадзінная аперацыя прайшла паспяхова.

Фота Вікторыі ДАЎНІ/АКБ.

Справа жыцця

ЗА СЯБЕ І ЗА ТАГО ХЛОПЦА...

Ён стаў урачом, каб працягнуць справу дзядзькі, якога забілі фашысты, і ў 90 гадоў лічыць, што выбраў правільны шлях

У Аляксея Сідаравіча ХОМЧЫКА, як і ва ўсіх людзей яго пакалення, няпросты лёс. За 90 гадоў давялося перажыць і ўзлёты, і падзенні. Наш герой прайшоў праз страшэннае ваеннае ліхалецце, цяжкі перыяд пасляваеннага аднаўлення. Выбраўшы ў свой час нялёгкую прафесію ўрача, ён працягнуў справу свайго дзядзькі. Сёння Аляксей Сідаравіч, заслужаны ўрач Беларусі, радуецца жыццю, якое дакладна было пражыта недарма. Знаходзіць натхненне і падтрымку ў сваёй сям'і, піша цудоўныя вершы. Разам з сынам Сяргеем яны распавялі карэспандэнтам «Звязды» пра складаны лёс і пра захаванне сямейных традыцый.

СТАР. 3

Фота Дзяніса ГОЛАЎ.

ШЛЯХАМІ ВЫЗВАЛЕННЯ

АПЕРАЦЫЯ З РАЗЛІКАМ НА ПЕРСПЕКТЫВУ

Напярэдадні Беларускай наступальнай аперацыі «Багратыён» партызаны ажыццявілі трэці этап «Рэйкавай вайны»

Безумоўна, гэта паскорыла вызваленчы працэс. Да сярэдзіны красавіка 1944 года завяршыўся першы этап вызвалення тэрыторыі Беларусі Чырвонай Арміяй. Да гэтага часу ад акупантаў было вызвалена 36 раёнаў Віцебскай, Магілёўскай, Гомельскай і Палескай абласцей, а таксама першыя абласныя цэнтры Гомель і Мазыр — практычна пятая частка БССР. Сотні тысяч нашых землякоў уладкоўвалі сваё жыццё ўжо на свабодных тэрыторыях. Аднак барацьба за мірнае жыццё працягвалася. І самы актыўны ўдзел у ёй прымалі народныя месціўцы. Партызаны выконвалі самыя розныя задачы, пастаўленыя савецкім камандаваннем. Асаблівая ўвага ўдзялялася нанясенню рэйкавых удараў па камунікацыях і лініях сувязі ворага.

Масавую дыверсію было вырашана правесці непасрэдна перад наступленнем нашых войск, у ходзе якога Беларусь была вызвалена. У ноч з 19 на 20 чэрвеня 1944 года партызаны падарвалі больш як 40 тысяч рэек. Удар быў настолькі магутны, што многія чыгуначныя магістралі не функцыянавалі да канца аперацыі «Багратыён». Як пасля адзначаў у сваіх мемуарах маршал Жукаў, народныя месціўцы паралізавалі варожы тыл у самы адказны момант.

СТАР. 5

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Большасць жыхароў ЗША асцерагаецца фальсіфікацый на выбарах

Вынікі апытання, праведзенага амерыканскай даследчай арганізацыяй Rasmussen Reports, паказалі, што 66 працэнтаў выбаршчыкаў у ЗША занепакоены магчымай фальсіфікацыяй, якая можа паўплываць на вынікі прэзідэнцкіх выбараў у краіне, паведаміла ТАСС. Так, 40 працэнтаў рэспандэнтаў назвалі свае апасенні глыбокімі, яшчэ 26 працэнтаў выказалі лёгкую занепакоенасць. Як вядома, чарговыя прэзідэнцкія выбары ў ЗША намечаны на 5 лістапада. Дзеючы прэзідэнт ЗША дэмакрат Джо Байдэн і былы кіраўнік дзяржавы рэспубліканец Дональд Трамп ужо гарантавалі сабе афіцыйнае вылучэнне ў якасці кандыдатаў ад дзвюх вядучых партый. Афіцыйнае зацвярджэнне іх кандыдатур павінна адбыцца на агульнанацыянальных партыйных з'ездах рэспубліканцаў і дэмакратаў у ліпені і жніўні адпаведна.

Звыш 330 тысяч тон адходаў у сектары Газа ствараюць катастрафічныя рызыкі для здароўя людзей

Пра гэта паведаміла Anadolu Ajansi са спасылкай на паведамленне Блізкаўсходняга агенцтва ААН для дапамогі палесцінскім бежанцам і арганізацыі работ у сацыяльнай сетцы. Публікацыя суправаджаецца фатаграфіямі з выявай дзяцей, якія корпаюцца ў смеццях. У арганізацыі падкрэслілі неабходнасць забеспячэння бесперашкоднага гуманітарнага доступу і неадкладнага спынення агню ў палесцінскім эксклаве для аднаўлення прымальных умоў жыцця. Раней у Блізкаўсходнім агенцтве ААН заявілі, што ізраільскія напады на сектар Газа цалкам змянілі жыццё мільёнаў палесцінцаў і нанесці велізарную шкоду навакольнаму асяроддзю і экалогіі, ад якіх залежаць тысячы вады, паветра, у тым ліку і прадуктаў харчавання. Каля 37,2 тысячы палесцінцаў, большасць з якіх жанчыны і дзеці, былі забітыя ў Газе з 7 кастрычніка мінулага года. Акрамя таго, больш за 84,8 тысячы чалавек атрымалі раненні.

Сотні культурных рэліквій паднялі з двух патанулых у Паўднёва-Кітайскім моры караблёў

Звыш 900 культурных рэліквій паднялі з двух патанулых старажытных караблёў, знойдзеных у Паўднёва-Кітайскім моры. Пра гэта заявіла Дзяржаўнае ўпраўленне па ахове культурнай спадчыны Кітая, паведаміла «Сіньхуа». Археалагічныя пошукі праводзіліся з 2023 года сумеснымі намаганнямі даследчых інстытутаў і мясцовага музея. З першага патанулага карабля паднялі 890 аб'ектаў, у тым ліку фарфоравыя і ганчарныя вырабы, а таксама медныя манеты. З другога судна паднялі 38 старажытных артэфактаў, уключаючы неапрацаваную драўніну, фарфоравыя і ганчарныя вырабы, ракавіны турбінід і аленевыя рогі. Як адзначылі намеснік кіраўніка Дзяржуправлення па ахове культурнай спадчыны КНР Гуань Цян, выяўленне помнікаў культуры на двух патанулых караблях служыць доказам таго, што продкі сучасных кітайцаў асвойвалі і выкарыстоўвалі Паўднёва-Кітайскае мора. Паводле яго меркавання, гэтыя судны служаць важным сведчаннем гандлёвых кантактаў і культурных абменаў Кітая ўздоўж старажытнага Марскога шаўковага шляху.

ISSN 1990 - 763X

24116

КАРОТКА

- **Мінабароны: прадстаўнікі 21 краіны пацвердзілі ўдзел у святкаванні Дня Незалежнасці Беларусі.**
- Валавы знешні доўг Беларусі скараціўся ў I квартале 2024 года на $0,5 млрд. Адносна ВУП знешні доўг скараціўся з 51,4 % на 1 студзеня 2024 года да 51,1 % на 1 красавіка. Пры гэтым на душу насельніцтва зменшыўся з $4,03 тыс. да $3,97 тыс. адпаведна.
- **Мост на дарозе Обаль — Полацк закрыты на рамонт, мяняецца рух транспарту.**
- Пачалася рэарганізацыя Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў.

Спажывец

ЛЕТНІ ЭКСКЛЮЗІЎ НА РЫНКАХ

Прыцэньваемся да падарункаў чэрвеня



Нябесная канцылярыя капрызіць, і многія наракаюць на гэты чэрвень за пераменлівасць і нестабільнасць надвор'я. Але лета ўсё ж наступіла. Гэта гараджанін, бледнае і незагарэлае дзіця асфальту, што праводзіць лета ў офісе, можа ацаніць па колькасці людзей на гарадскіх пляжах у пагодлівы вечар і — па асартыменце рынкаў.

Як заўсёды, на старце продажаў цана на падарункі чэрвеня часам здаецца ну проста непрыстойнай. Але ж першае заўсёды самае смачнае, таму і самае дарагое. Узброімся цярпеннем: тут час за нас, пакупнікоў. Прапанова на рынках будзе расці, а цэны — няхай на многія пазіцыі і не занадта, — але ўсё ж падаць.

СТАР. 8

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2024 года

Мы абяцаем нясумны час з любімай газетай.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Извещение о проведении электронных торгов в форме электронного аукциона	
Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607. УНП 191021390
Продавец	Частное предприятие «Скрепли-Инвест», Минский р-н, Колодищанский с/с, а. г. Колодищи, ул. Тюленина, д. 18/1, пом. 6, УНП 692206955
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5, УНП 191224638 (www.ipmtorgi.by)
Предмет электронного аукциона	
Административное помещение 564 кв. м. (инв. № 500D-7077018, составные части и принадлежности: технич. помещения в подвальном этаже 17 м², 10,3 м², 16,6 м², 17,2 м², 10 м², 16,2 м², 10,5 м², 15,1 м², 418,7 м², два балкона) Адрес: **г. Минск, ул. Мельникайте, 2-3** (В-й этаж)	
Начальная цена лота с НДС 20 % – 394 800,00 долларов США	
*Примечание: цена продажи лота фиксируется в протоколе о результатах аукциона в сумме в белорусских рублях, эквивалентной цене продажи лота в долларах США по курсу НБРБ на дату проведения аукциона	
Обременения по лоту: площади помещений частично сданы в аренду. Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона	
Задаток 120 000,00 бел. руб. перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (г. Минск) БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»	

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона
Условия оплаты предмета электронных торгов: оплата должна быть произведена в течение **14 (четырнадцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи
Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах
Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы». Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении открытого аукциона

Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» **22 июля 2024 года в 11.00** проводит открытый аукцион по продаже имущества

№ п/п	Сведения о предмете аукциона	Начальная цена продажи без НДС, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
Лот 1	Бульдозер SHANTUI SD-32, заводской номер SD32AA102965, год выпуска 2010, регистрационный знак 9682 ТА-6, инвентарный номер 2961	30 000,00	3000,00
Лот 2	Экскаватор гусеничный JCB JS220SC, заводской номер JCBJS220CA61203762, год выпуска 2006, регистрационный знак ТК-6 3057, инвентарный номер 654	102 000,00	10 200,00

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 802220712424.
2. Дата, время и место проведения аукциона: **22 июля 2024 года в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, конференц-зал.
3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» (утвержденное приказом генерального директора № 5 от 03.01.2022).
4. Участник аукциона за 3 рабочих дня до проведения аукциона должен подать заявление на участие в аукционе, подписать с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000, код BPSBBY2X в ОАО «Сбер Банк», УНП 700049607
5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: 212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: **16.07.2024 г., время: 17.00**.
6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.
7. Сроки подписания договора купли-продажи: договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и предоставления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней.
8. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола.
9. Извещение о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» размещено в газете «Звязда», на сайте ОАО «ДСТ № 3».